Алесь БЕЛЬСКІ

# ДУША І СЛОВА

## ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ВАСІЛЯ РАГАЎЦОВА

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У адной з вершаваных карацелек Р. Барадулін ёміста, трапна заўважыў: "Нялёгкае гэта мастацтва – / Падобным да сябе заставацца..." А ў іншым творы глыбакадумна сказаў: "Вядзе душу дапытны лёс, / А лёс вядзе душа". Барадулінскія радкі арганічна стасуюцца да асобы і творчасці Васіля Рагаўцова, чые зборнікі "Імгненне і Вечнасць" (2010), "Імгненне і Вечнасць – 2" (2013) сталі пэўным падрахункам ад моманту выхаду першай паэтычнай кніжкі. Два гэтыя выданні – адно цэлае. Другая кніга ўдакладняе першую. Рэч у тым, што аўтар дапрацаваў вершаваныя тэксты з аднайменнага зборніка "Імгненне і Вечнасць", а таксама з паэтычных кніг "Сутонне" (1995), "Долягляд" (1998), "На роскрыжы дарог" (2008). Добра вядома: нярэдка пісьменнікі вяртаюцца да ранейшых твораў, правяць і ўдасканальваюць іх. Адзін з прыкладаў – верш "Бывай..." А. Куляшова, радкі якога паэт шліфаваў-даводзіў на працягу амаль усяго жыцця. Апошні варыянт куляшоўскага твора – маленькі паэтычны шэдэўр. Зрэшты, яшчэ М. Багдановіч калісьці раіў "гартаваць гібкі верш, абрабіць яго... з цярпеннем". Вось і В. Рагаўцоў імкнецца да высокага ўзроўню майстэрства, мастацкай дасканаласці вершаваных тэкстаў. Прапанаваны ім на суд чытачоў збор твораў у дзвюх частках – сведчанне адказнай творчай працы са словам, а перадусім – адметнае светаадлюстраванне асобы аўтара, яскравы адбітак яго паэтычнай думкі і душы.

Васіль Рагаўцоў выступае пераважна ў жанры паэтычнай мініяцюры. Яго карацелькі ў асноўным ад трох да дванаццаці радкоў, прычым у структуры твора многія вершарады налічваюць ад аднаго да двух-трох слоў. Паэт выказваецца сцісла, нават лапідарна, з афарыстычнай ёмістасцю. Напісаны яго міні-вершы, як і мініяцюры Я. Брыля ці Р. Барадуліна, "у адной манеры, пры дапамозе адной і той жа тэхнікі: мастацкага мазка, які фіксуе імгненне. Гэта імгненні, цяперашнія або захаваныя памяццю, – ці то бачнага, знешняга жыцця (свайго і нагледжанага), ці то перажывання, думкі" (Ю. Канэ). В. Рагаўцоў фіксуе імгненні свайго душэўнага стану і вопыту, перадае праз слова тое, што адчувае

і спазнае ў чалавечым быцці. Яго мініяцюры напісаны ў філасофска-разважлівай стылёвай манеры.

Разважаючы пра суадносіны ў чалавеку рацыянальнага і эмацыйнага, В. Рагаўцоў прыходзіць да наступнага меркавання: "*З-пад улады Розуму / Трапляеш у палон Душы. / І так бясконца. / Пакуль нітуецца / Жыццё*" ("Душа і Розум..."). У іншым творы ён гаворыць яшчэ больш вобразна: "*Розум і Душа – / што месяц і сонца. / Адно свеціць, / а другое – / яшчэ і грэе*" ("Розум і Душа..."). Заўважце: слова *Душа* пішацца з вялікай літары. Дарэчы, не толькі ў гэтых, але і ў многіх іншых вершаваных тэкстах аўтара. Вобраз падкрэслена абсалютызуецца і нават гіпербалізуецца: "*Душа радуецца*"; "*смыліць Душа*"; "*лёгкай Душою*"; "*спатоль ад самоты Душу*"; "*чужой Душы*"; "*несмяротнасцю Душы*" і інш. Слова-паняцце свядома вылучаецца і ўзвышаецца як сэнсава значнае, канцэптуальнае. Душа, можна сказаць, – лірычны дзейны герой яго вершатворчасці. Паэт пастаянна апелюе-звяртаецца да душы, думае і гаворыць пра яе, засяроджваецца на розных станах, праявах унутранага "я". Яна – свет жывы і складаны, чуйнае люстэрка настрояў:

*Спявае Душа ад смутку –*
*ды спеў той журботны.*

*Сумуе Душа ад гуллівасці –*
*толькі сум бесклапотны.*

*Смяецца Душа ад зайздрасці –*
*ды смех той калючы.*

*А плача Душа ад радасці –*
*плач той... гаючы.*

"Спявае Душа ад смутку..."

У душы сканцэнтраваны ўвесь багаты і разнастайны змест чалавечага жыцця. Пра гэта красамоўна гаворыць у вершаваных тэкстах В. Рагаўцова вялікая колькасць матыўных гнёздаў і вобразных асацыяцый, звязаных са словам *душа*: "*пакідаю там, за парогам, часцінку душы*"; "*лучыць душы берагі*"; "*душу... хутчэй сагрэе*"; "*каб не знявечыўся душою*"; "*голас збедавалай душы*"; "*рвецца душа ў восень*"; "*расхістаныя струны душы*"; "*засталіся адзінокімі душою*"; "*вярэдзіць душу*"; "*на душы – зіма*"; "*ратунак душы*" і інш. Свет душы – надзвычай насычаная эмацыйная сфера, дзе вызначальным з'яўляецца рухомае, зменлівае пачуццё. Нягледзячы на такую дынаміку, у ёй ёсць штосьці пэўнае, устойлівае, нязменнае: "*А кахаюць – / толькі Душою*" ("Любіць..."). Паэт імкнецца спасцігнуць унутраны космас, шматгранна і шматлучна раскрыць сваё светаўспрыманне і светаадчуванне. Ён фіксуе самыя разнастайныя моманты і модусы душэўнага стану – ад радаснага, узнёслага да маркотнага, глыбока драматычнага. Працэс спазнання ўнутранага, пачуццёвага свету адбываецца праз роздум-медытацыю, саманазіранне, рэфлексію, успамін, сэнсавую алюзію, вобразны кантраст.

Слухаць, вычуваць душу і адгукацца на яе жывы покліч – ці не ў гэтым прызначэнне паэта? Васіль Рагаўцоў так фармулюе ўласнае творчае крэда: "*Каб нараджаліся вершы. / Аб зямных радасцях. / Аб пакутах, / якія ачышчаюць Душу...*" ("Паэту дарагія..."). Ён даводзіць: "*Але ж і пакуты – / таксама творчасць... Душы*" ("Творчасць..."). І задумваецца: "*Навошта спяваць, як душа не пяе. / Услухайся лепш / у яе*" ("Калі не пяецца – навошта й спяваць..."). Душа – індыкатар стану асобы, паказальнік глыбіні і сталасці пачуццяў. Асабліва тады, калі гэта душа паэта, які валодае тонкім светаадчуваннем: "*Млоснагоркі ўспамін / так вярэдзіць душу... / Каб хоць трохі душы / палягчэла!*" ("Так вярэдзіць душу..."). Чалавек, на думку паэта, сумуе "*па ўсім, што ў яго душы і сэрцы*" ("Дрэвы сумуюць па птушках..."). Як бачым, вобраз душы – дамінанта мастацка-крэатыўнага мыслення В. Рагаўцова, ментальны і эмацыйны цэнтр у тэкставай прасторы яго вершатворчасці.

Душа для В. Рагаўцова – вымярэнне чалавечай існасці, там, у ёй, паэт найперш шукае сапраўднае, Боскае і вечнае. Гэта аксіёма: без душы няма і не можа быць чалавека. Яна – крыніца дабра і зла, святла і змроку, свет таямнічы, складаны і супярэчлівы: "*А ў Душы выспявае / спагада і зайздрасць, / надзея і роспач, / каханне і здрада... / А часам – / і нянавісць. / Не толькі да іншых – / і да сябе*" ("У цішыні спее..."). Паэт суадносіць глыбока душэўнае, сакральнае і жыццёвае, зямное, грахоўнае: "*А мне яшчэ болей шкада / сляпых Душою*" ("Шкадуюць..."); "*І пры святле / можна хадзіць як цень. / Калі душа – / шэрая*" ("І пры святле..."); "*Іржа раз'ядае / жалеза, / дым – / вочы, / зайздрасць – / сумленне... / А хлусня – / Душу, / без якой у чалавеку / няма Чалавека*" ("Іржа раз'ядае..."). У аўтарскіх максімах і сентэнцыях сканцэнтраваны жыццёвы і маральны вопыт паэта, вынашанае ў думках і выспеленае ў яго душы.

Паводле паэта, душа – гэта найперш чалавечае ў чалавеку, тое, па чым можна меркаваць пра вартасць і годнасць асобы. У вершы прытчавага характару "Прысніўся сон..." аўтар увасабляе сэнсава значную і актуальную маральна-этычную думку: страціць душу – значыць згубіць сваё сапраўднае аблічча, а таму галоўнае – заставацца чалавекам і быць ім. Паэт міфалагізуе зло, якое забівае і адбірае душу, у вобразе прышлага ваўка-пярэваратня:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Не... Не! То –*
*голас чалавекавоўка*
*з драпежнай, крыважэрнаю душою,*
*з халоднымі і хітрымі вачыма...*
*З усіх людзей ён чыніць ваўкалюдаў,*
*нявечыць, хіжань, душы чалавечыя*
*і робіць іх жабрачымі, нікчэмнымі...*

Застацца без душы і памяці – вось самае страшнае пакаранне. "*Каб жыццё было часцінкай / гармоніі*", – такой высновай заканчваецца адзін з вершаў-роздумаў В. Рагаўцова ("Гармонія..."). Паэт усхвалявана думае пра гарманічнае душэўна-чалавечае ўладкаванне жыцця. А гэта сведчыць пра глыбока этычную пазіцыю аўтара, гуманізм як вызначальную рысу яго духоўна-інтэлектуальных шуканняў.

Асабліва сэнсава важнае месца ў творчасці паэта набывае матыў душэўнай пакуты. Сэрцам успрыняць боль, бяду іншага чалавека, яго цяжкі, няпросты стан – значыць глыбей адчуць сваю існасць:

*Каб маглі зазірнуць*
*у чалавечую душу,*
*нібыта ў люстэрка, –*
*як бы сумеліся мы*
*ад яе разгубленасці:*
*пакутуе Душа...*

"Каб маглі зазірнуць..."

Паводле біблейска-хрысціянскага светаразумення, чалавеку даюцца "пакуты [паводле іншага перакладу – пакаянне] на адпушчэнне грахоў" (Марк, 1, 4). Прайсці праз пакуты – значыць прайсці праз ачышчэнне, пазбавіцца грахоў:

*Прызнанне*
*ў сваіх грахах –*
*споведзь.*
*Бо ачышчаецца Душа.*
*Дараванне*
*іншым грахоў –*
*святасць.*
*Бо ўзвышаецца Душа.*
*А папрокі за грахі –*
*слабасць.*
*Бо нішчымнее*
*Душа.*

"Прызнанне..."

На жаль, чалавеку "*прыходзіцца сумаваць... / і ўсё часцей / і часцей*". Сёння "*шмат душ пакутных і змарнелых*". У чалавечую сутнасць пранікае негатыўнае, эгаістычнае, грахоўнае. Гэтаму аўтар супрацьпастаўляе светлы пачатак і чысціню жыцця, якія ён увасабляе ў вобразах і лексемах са станоўчай канатацыяй: "*І на душы світанне – / святое, як каханне*" ("Імпрэсія"); "*...Я п'ю святло – і ачышчэнне / Душу спатольвае і цела*" ("Чакаю ночы як збавення..."). Можна казаць пра рэлігійна-хрысціянскую аснову светаадчування аўтара як вызначальную.

Такім чынам, у паэтычнай творчасці В. Рагаўцова душа – філасофскі вобраз-канцэпт, найвышэйшая і першаступенная маральная катэгорыя. Больш за тое, у аўтарскай інтэрпрэтацыі яна паўстае як галоўная крыніца катарсісу чалавека. Безумоўна, душа – вечная трансцэндэнтная субстанцыя і каштоўнасць быцця. Таму невыпадкова менавіта гэтае слова-паняцце – ідэяўтваральнае ядро ў духоўна-паэтычным свеце В. Рагаўцова.

Падкрэслена сімвалічнае значэнне ў змястоўна-сэнсавай структуры твораў паэта набываюць таксама такія абстрактныя паняцці і абагульненыя катэгорыі, як Дух, Воля, Надзея, Дабро, Зло, Святло, Цемра, Час, Імгненне, Вечнасць і некаторыя іншыя.

У творчасці В. Рагаўцова нароўні з катэгорыяй *Душа*, бадай, самая значная моўна-канцэптуальная адзінка, сэнсавая дамінанта – лексема *Слова* (аўтар піша менавіта так – з вялікай літары). Па сутнасці, гэта ключавы мегаканцэпт. У прадмове да кнігі "Імгненне і Вечнасць" (2010) К. Камейша адзначае, што "да самога слова ў В. Рагаўцова вельмі своеасаблівыя, нават болеадчувальныя адносіны" ("І шлях, і пошук..."). Аўтар прадмовы мае рацыю. Слова для паэта – крыніца натхнення, радасці і асалоды: "*Спеліцца, / прамаўляецца / Слова... / Радуе і акрыляе*" ("Спеліцца..."). Паэт гаворыць пра еднасць душы і роднага слова, іх непарыўнае адзінства: "*Калі ж прыходзіць Слова да мяне – / я Слову рад, як шчодрай навальніцы, / што дасць душы сасмяглай наталіцца...*" ("...Калі находзіць радасць на мяне..."). Наталенне сакавітым беларускім словам для В. Рагаўцова стала пакліканнем і патрэбай душы – і як для даследчыка-лінгвіста, і як для мастака-творцы. У адным з версэтаў А. Разанаў прызнаўся: "Я ў крузе, дзе слова шукае Слова..." ("У крузе"). Вось у такой прасторы Слова існуе і выяўляе сябе В. Рагаўцоў. Слова, на яго думку, трэба адчуваць як жывое, як штосьці вельмі шчымлівае і блізкае сэрцу:

*А той, хто не спазнаў*
*шчымлівасці Слова,*
*тужлівасці шчасця,*
*асалоды адзіноты...*
*Той – не паэт.*

"...А той, хто не ўчуў..."

Душа выяўляецца праз Слова. Шукаючы жыццядайную глебу для творчасці, паэт усклікае: "*...як маці на покліч дзіцяці – / на Слова, Душа, адгукніся!*" ("Як гром на жагнанне маланкі..."). Як можна пераканацца, у творчасці В. Рагаўцова пануе высокі духоўны і эстэтыч-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ны культ Слова. Зразумела, Слова роднага, беларускага, Слова паэтычнага, вобразнага, мастацкага.

Пісьменніка няма без выдатнага валодання мовай. Нагадваючы гэтую ісціну, Н. Гілевіч упэўнены, што творцу важна "любіць, шукаць і знаходзіць слова", і, спасылаючыся на творчы досвед вядомага майстра, адзначае: "...галоўнае для паэта – слова: пачуццё слова, пошукі слова, праца над словам" ("Урокі Маякоўскага"). Пошукі слова, словатворчасць – тое, што займае Рагаўцова-паэта. Вось адзін з прыкладаў высвятлення асацыятыўна-сэнсавай сувязі слоў-з'яў:

*Зліваецца з рэхам:*
*рэха – ў прасторы,*
*прастора – у рэху...*
*Рэхапрастора.*

"Рэха званкое..."

Праца паэта са словам пераконвае ў тым, што гэта па-мастацку займальны і жыватворны працэс. З кніг В. Рагаўцова можна выпісаць цэлы каталог аўтарскіх лексічных наватвораў, што надаюць яго моўна-паэтычнай карціне свету адмысловы каларыт. Паэт скарыстоўвае і рэдкаўжывальныя беларускія словы. Вялікая колькасць лексічных утварэнняў – складаныя словы, якія набываюць адметнае сэнсава-выяўленчае значэнне. Самы пашыраны рэестр складаных слоў – двайныя назоўнікавыя спалучэнні: *доджык-пырскуль*; *гром-вястун*; *грамыкавалі*; *грымоты-навальніцы*; *месяц-сярпок*; *месячык-чоўнік*; *зоркі-маністы*; *знічкі-чараўніцы*; *мілавіца-сняжынка*; *ціша-сястрыца*; *восень-просінь*; *смужынка-просінь*; *зара-світанак*; *агонь-цудадзей*; *цямрэва-ночка*; *лісты-даланіцы*; *суша-спякота*; *вецер-свавольца*; *бакен-агеньчык*; *кудзеркі-пухавінкі*; *варэйка-пузатка*; *бусел-глячок*; *ніты-красёнцы*; *туман-сырадой*; *сок-крывіца*; *песні-літанні*; *хвіля-часіна* і інш. Аўтар імкнецца вобразна, больш ярка выяўляць пэўную прыродную з'яву, перадаваць сваё абвострана-паэтычнае ўспрыманне свету. У шматмернай моўнай прасторы В. Рагаўцова звяртае ўвагу ўмелае спалучэнне прыметнікаў: *зорнаблішчастая роўнядзь*; *гулліва-шчабятлівыя галасы*; *шчымліва-расстайная мелодыя*; *тужліва-маркотныя вочы*; *аднастайна-роспачнае жыццё*; *вусцішна-мяккая цішыня* і інш. Як бачым, у выніку аўтарскага сінтэзу часам з'яўляюцца па-мастацку адметныя аказіянальныя ўтварэнні. Выкарыстанне падвойнай лексічнай мадэлі – вынік пошуку паэтам дакладнага, ёмістага слова, каб зафіксаваць "*мімалётнае, плыннае*", перадаць сваё захапленне "*красою Імгнення*". Слова, паводле У. Тапарова, "асаблівая творчая сіла, з дапамогай якой адбываецца падвойнае тварэнне, ствараецца свет у слове і адбываецца пераўтварэнне звычайнага тэксту ў паэтычны. І ў гэтым тварэнні мова, слова... злучае боскае і нябеснае з чалавечым і зямным" («Об "эктропическом" пространстве поэзии»). Толькі ў змястоўна-тэкставым кантэксце слова атрымлівае экспрэсіўнае значэнне, пэўнае сэнсавае ці эмацыйнае адценне, набывае гукавыяўленчую сілу: "...*Кружляе Дух мой птахам-чарадзеем / на дозлягладзе*" ("Дзе тояцца душы тваёй пакуты?..").

У слове-вобразе адлюстроўваецца арыгінальнасць аўтарскага светаўспрымання і светаадчування. Убачыць і сказаць па-свойму непаўторна – вось у чым галоўная задача мастака слова. Гэта даўняя аксіёма. У якасці прыкладу зацытую радкі П. Панчанкі: "Вясною на елчыных лапах адростваюць / Светла-зялёныя пальцы" ("Белыя яблыні"). А вось паэтычны малюнак В. Рагаўцова, дзе паэт пры дапамозе аказіянальнага словаспалучэння стварае адметны мастацкі вобраз: "*Спытаўся ў ветру: / – Ты дзе спачываеш, / вятрыска? / – У задумным бары. / Як лагоджу я ручанькі-лапкі лахматым ялінам*" ("Спытаўся ў ветру..."). Гэтыя вершаваныя радкі – адзін з яскравых прыкладаў аўтарскага паэтычнага адкрыцця свету. Зрэшты, паэт адчувае не толькі магчымасці, патэнцыял Слова, але невымоўнасць асаблівага стану чалавека: "*Нявымаўленае – / вымавіцца. / А невымоўнае / можна адчуць – / у голасе, позірку... / Яно – таямніца, / непадуладная Слову*" ("Нявымаўленае..."). Тым не менш з дапамогай слова аўтару ўдаецца па-мастацку асвойваць аб'ектыўную рэальнасць і ствараць яркія вербальныя асацыяцыі, перадаваць важныя анталагічныя сэнсы і багаты пачуццёвы змест чалавечай душы.

Словаўтваральнае майстэрства ў паэзіі В. Рагаўцова на вышыні, заслугоўвае ўхвалення. Вельмі прыкметная жанрава-фармальная шматстайнасць яго творчасці: імпрэсія, сказ, хоку, танка, трыялет, акраверш, песня, элегія... Відавочна, аўтар надае вельмі важнае значэнне структурнай мадэлі верша. І гэта добра. Фармальна-стылістычны бок асобных твораў часам нагадвае досыць знаёмыя першаўзоры. Лёгка распазнаецца тэхналогія танкаўскага верлібра ў вершаваных тэкстах "...Зямля – з хлебам...", "Спыталіся ў заможніка...", "Пры сустрэчы..." і некаторых іншых.

Аднак у творчасці Васіля Рагаўцова найперш прываблівае галоўная яе рыса – духаўздымнасць, а таксама хараство і каларытнасць паэтычнай мовы. Сапраўды, Душа і Слова – вялікія стымулы жыцця і паэзіі, сэнсава значныя цэнтры духоўнага прыцягнення як для творцы, так і для чытачоў-рэцыпіентаў яго вершаў і кніг.

*Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова